**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за красавік 2022 г.**

**<u>Мерапрыемствы да Года гістарычнай памяці</u>**
**<u>Мерапрыемствы да Дня яднання Беларусі і Расіі</u>**
**<u>Мерапрыемствы да 36-годдзя аварыі на Чарнобыльскай АЭС</u>**

З 1 па 3 красавіка ў бібліятэках ДУК прадоўжыліся мерапрыемствы ў рамках Тыдня дзіцячай і юнацкай кнігі. **З 1 па 30 красавіка прайшла акцыя «И помнить страшно, и забыть нельзя».**

**1 красавіка**

Для вучняў СШ №4 прайшоў урок садружнасці «Беларусь и Россия в союзе едином». Бібліятэкары расказалі прысутным пра гісторыю ўтварэння садружнасці Беларусі і Расіі, падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, пазнаёмілі з творчасцю сучасных расійскіх і беларускіх пісьменнікаў.

Удзельнікі мерапрыемства з цікавасцю адказвалі на пытанні віктарыны «Мы разные, но мы вместе». Праслухалі песні «Сердце земли моей», «Родина», «Аист на крыше», «Я живу в заповедном краю», «Дзень добры, родныя мясціны» ў выкананні вакальнай групы «Фантазия» і Людмілы Боцэх, азнаёміліся з кнігамі, прадстаўленымі на выставе «Беларусь и Россия: историческая и духовная общность».

ЦБ, 14 чал.

**2 красавіка**

Для навучэнцаў Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа прайшла літаратурна-музычная кампазіцыя «Беларусь и Россия: единство двух народов». Бібліятэкары расказалі прысутным пра гісторыю ўтварэння садружнасці Беларусі і Расіі, падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, пазнаёмілі з творчасцю сучасных расійскіх і беларускіх пісьменнікаў.

ЦБ, 25 чал.

**3 красавіка**

У бібліятэцы прайшоў урок садружнасці «Дружба народов – дружба литератур». Падчас мерапрыемства дзецям паказалі слайд-прэзентацыю «Два государства – один народ», якая пазнаёміла з гісторыяй дзвюх краін-суседак. Тэматычная віктарына «Минск – Москва» пацвердзіла, што толькі саюз дзвюх дзяржаў адкрывае новыя перспектывы для рэалізацыі розных праектаў ва ўсіх сферах дзейнасці. Падчас мерапрыемства прагучалі вершы беларускіх і рускіх паэтаў пра сяброўства нашых народаў, а таксама новы верш Надзеі Момлік «Беларусь и Россия».

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 15 чал.

**5 красавіка**

Для падапечных аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН прайшла патрыятычная гадзіна «Наша сила в единстве». Бібліятэкары расказалі прысутным пра гісторыю ўтварэння садружнасці Беларусі і Расіі, падпісанне Дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы, пазнаёмілі з творчасцю сучасных расійскіх і беларускіх пісьменнікаў.

ЦБ, 29 чал.

**10 красавіка**

Бібліятэка правяла ўрок памяці і патрыятызму «Дети – жертвы Холокоста». Дзеці пазнаёміліся з гісторыяй трагедыі Халакосту, прагледзелі відэапрэзентацыю «Холокост. Помнить, чтобы не забыть!». Сваімі ўспамінамі з навучэнцамі пра тыя страшныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны і генацыду, абвешчаныя фашысцкай Германіяй, падзялілася сведка страшнай трагедыі – Вецель Соф'я Фёдараўна.

Лукская ПБ, 18 чал.

**11 красавіка**

Гісторыка-літаратурны вечар «Мы помним ту войну и ужас прошлых дней…», прымеркаваны да Міжнароднага дня вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў, прайшоў пры ўдзеле пракурора Кобрынскага раёна Сяргея Анатольевіча Мяшэчка, Ганаровага грамадзяніна Кобрынскага раёна Кузіча Уладзіміра Рыгоравіча, старшыні Кобрынскай арганізацыі грамадскага аб'яднання Беларускай асацыяцыі былых непаўналетніх вязняў фашызму Аркадзя Пятровіча Цітова.

Навучэнцы Кобрынскага дзяржаўнага прафесійнага ліцэя сферы абслугоўвання і Кобрынскага дзяржаўнага палітэхнічнага каледжа з цікавасцю слухалі расказ пра гісторыю ўзнікнення гэтага памятнага дня, пра злачынствы фашыстаў у канцлагерах, пра злачынствы супраць дзяцей, пра тое, што адбывалася з мірнымі жыхарамі, якія трапілі ў канцэнтрацыйныя лагеры.

*(Кобрынскі веснік. – 2022. – 20 красавіка. – С. 6)*

ЦБ, 96 чал.

**15 красавіка**

Чарговая вучоба супрацоўнікаў публічных бібліятэк ДУК прайшла ў форме творчай лабараторыі «Библиотека, как ресурс сохранения и развития исторической памяти региона». Дырэктар установы пазнаёміла з вынікамі работы бібліятэчнай сістэмы ў Год гістарычнай памяці за 1 квартал 2022г., паставіла задачы на перыяд, які будзе. Загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу прааналізавала правядзенне мерапрыемстваў сельскімі бібліятэкамі раёна па тэме «Геноцид белорусского народа». Супрацоўнікі публічных бібліятэк раёна паказалі фота сваіх кніжных выстаў па дадзенай тэме, расказалі пра пошук матэрыялаў для іх арганізацыі. У рамках конкурсу відэапрэзентацый «Гонар маёй вёскі» прадстаўлены відэапрэзентацыі Іменінскай і Лукскай публічных бібліятэк. Адбылася жывая і канструктыўная гутарка пра ўдасканаленне працы па захаванні і развіццё гістарычнай памяці.

ЦБ, 28 чал.

**19 красавіка**

У бібліятэцы прайшоў вусны часопіс «Маленькие герои большой войны» для вучняў 2 «А» класа СШ №1. Дзеці даведаліся пра подзвігі сваіх аднагодкаў, якія ў гады Вялікай Айчыннай вайны ваявалі з ворагам, прагледзелі прэзентацыю «В их детство ворвалась война». Бібліятэкар паказала партрэты піянераў-герояў і расказала пра іх подзвігі.

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 21 чал.

**22 красавіка**

Бібліятэкары для дзяцей 8-х класаў правялі гістарычную гадзіну «Чернобыль: взгляд сквозь время». З прэзентацыі «Трагедия Чернобыля» дзеці даведаліся пра герояў-пажарнікаў, вайскоўцаў, якія прынялі самы страшны ўдар на сябе і памерлых пасля ад прамянёвай хваробы. Гучалі вершы пра Чарнобыль. У памяць пра гэту трагічную дату ў бібліятэцы была аформлена кніжна-ілюстраваная выстава «Чернобыль – эхо ядерного века».

Філіял «Дзівінская публічная бібліятэка», 15 чал.

**26 красавіка**

У бібліятэцы прайшла дакументальна-публіцыстычная гадзіна «Чернобыля полынная звезда», прымеркаваная да Дня чарнобыльскай трагедыі. Бібліятэкары расказалі навучэнцам Кобрынскага ДПТК аб трагедыі, якая адбылася на Чарнобыльскай АЭС, жахлівыя лічбы наступстваў катастрофы, пра мужнасць і гераізм тых людзей, хто прыняў удзел у ліквідацыі наступстваў аварыі, правялі агляд кніг «Чернобыль в памяти и книгах». Мерапрыемства суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі «Последствия страшной беды».

ЦБ, 28 чал.

**28 красавіка**

У бібліятэцы прайшоў вечар памяці «Взорвавшийся атом» для вучняў СШ №1 г. Кобрына. Бібліятэкары расказалі аб трагедыі, якая адбылася на Чарнобыльскай АЭС, жахлівыя лічбы наступстваў катастрофы, пра мужнасць і гераізм тых людзей, хто прыняў удзел у ліквідацыі наступстваў аварыі, правялі агляд кніг «Чернобыль в памяти и книгах». Мерапрыемства суправаджалася праглядам відэапрэзентацыі «Последствия страшной беды».

ЦБ, 21 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

**7 красавіка**

Бібліятэкар сумесна з працаўнікамі Дома культуры правялі гадзіну духоўнасці «Животворящий свет любви». Ігумен храма Архістратыга Міхаіла бацька Сергій павіншаваў прысутных з праваслаўным святам, расказаў пра гісторыю яго ўзнікнення і пазнаёміў з абразом «Благовещение Пресвятой Богородицы». Бібліятэкар правяла агляд выставы праваслаўнай літаратуры «Книжный мир православия».

Навасёлкаўская ПБ, 70 чал.

**14 красавіка**

Адкрытае пасяджэнне аматарскага клуба «Светлячок» прайшло ў фармаце літаратурнага свята «Наша сяброўка «Вясёлка» (да 65-годдзя выхада першага нумара дзіцячага літаратурна-мастацкага часопіса). Бібліятэкар адправілася разам з навучэнцамі 2 «А» класа СШ №1 у падарожжа па старонках часопіса. Да мерапрыемства аформлена кніжна-ілюстрацыйная выстава «Вясёлка».

Філіял «Дзіцячая бібліятэка», 21 чал.

**14 красавіка**

Аматарскі клуб «Родник» Залескай публічнай бібліятэкі сумесна з Цэнтрам культуры і вольнага часу правялі духоўна-асветніцкія чытанні «Страстная седмица» з удзелам протаіерэя Пятрапаўлаўскай царквы г. Кобрына бацькі Сергія. Члены клуба акцэнтавалі ўвагу на значэнні Вялікага паста, на падзеях, якія папярэднічалі Ускрысенню Хрыстоваму, на значэнні кожнага дня Перадвелікоднага тыдня, таксама разгледзелі, як гэта тэма адлюстравана ў літаратуры на прыкладзе А. С. Пушкіна, Г. Ахматавай, А. Пляшчэева і інш. Выкарыстоўвалася аднайменная прэзентацыя і выстава літаратуры.

Залеская ПБ, 42 чал.

**16 красавіка**

Чарговае пасяджэнне літаратурнага клуба «ПаэтыКо», які працуе пры Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэцы, прайшло ў фармаце літаратурнага салона «Паэзія – мая душа». Аўтары чыталі свае вершы, у тым ліку напісаныя для дзяцей у якасці хатняха задання. На ўроку па вершаскладанні адбылося вывучэнне паэтычных фігур мовы.

Асобнай часткай праграмы стаў аповед вучаніцы 10 класа гімназіі Вікторыі Несцярук пра перамогу ў рэспубліканскім конкурсе эсэ «Пуцявінамі беларускага пісьменства».

ЦБ, 9 чал.

**27 красавіка**

У інфармацыйна-сэрвісным цэнтры пройшоў вечар бардаўскай песні «Изгиб гитары желтой», прысвечаны ушанаванню кобрынскага барда Мікалая Крывагуза. Для гасцей прагучалі музычныя нумары ў выкананні ўдзельнікаў тэатра-студыі «Піражок» Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі - Віктара Бордзюга і Надзеі Пракаповіч. Мікалай Крывагуз падараваў гасцям свае лепшыя песні: «Струны души», «Велосипед», «Полюби меня жизнь», «Где же ты?».

ЦБ, 35 чал.

**29 красавіка**

Для падапечных аддзялення дзённага знаходжання для інвалідаў і грамадзян пажылога ўзросту Кобрынскага ТЦСАН у рамках праекта «Библиотека без границ» адбыўся музычны калейдаскоп «Словно яркая раскраска в гости к нам явилась Пасха». Госці бібліятэкі акунуліся ў святочную атмасферу светлага свята Вялікадня, прагарталі старонкі гісторыі свята, пазнаёміліся з кнігамі велікоднай тэматыкі на выставе «Праваслаўе –

падмурак беларускай нацыі». Гучнымі апладысментамі і словамі падзякі сустрэлі гледачы музычныя нумары, падрыхтаваныя вакальнай групай «Фантазия» цэнтральнай бібліятэкі.

ЦБ, 25 чал.

Зыбайла К. І.
Тэл. 3 85 81